III этап XXVII Рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў
па беларускай мове і літаратуры

Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

# ДАВЕДКІ

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **5** | **5** | **5** | **5** | **5** | **3** | **7** | **9** | **6** | **5** | **55** |

**9 клас**

**Варыянт 1**

**Заданне 1**

| | |
|---|---|
| **сінонімы:** | вялікі – велічэзны, круціцца – кружыцца |
| **паронімы:** | звычайны – звычаёвы, начынка – начынне |
| **амографы:** | абка́паць – абкапа́ць, пры́клад – прыкла́д |
| **амафоны:** | грубка – групка, козка – коска |
| **амаформы:** | знаць *(назоўнік)* – знаць *(інфінітыў)*, піла *(назоўнік)* – піла *(дзеяслоў, пр. ч. ж.р.)* |

**Заданне 2**

| | |
|---|---|
| **1. лінгвістычныя тэрміны:** | *афікс, лексікаграфія, сінтаксіс, стан;* |
| **2. літаратуразнаўчыя тэрміны:** | *легенда, пародыя, санет, троп;* |
| **3. лінгвістычныя і літаратуразнаўчыя адначасова:** | *метафара, неалагізм.* |

**Заданне 3**

| | |
|---|---|
| ***1) маўчанне золата*** | *Слова – серабро, а **маўчанне – золата**.* |
| ***2) спатрэбіцца вады напіцца*** | *Не плюй у калодзеж – **спатрэбіцца вады напіцца**.* |
| ***3) пагнацца за двума зайцамі*** | ***За двума зайцамі пагонішся** – ніводнага не зловіш.* |
| ***4) конь на чатырох нагах*** | ***Конь на чатырох нагах**, і то спатыкаецца.* |
| ***5) ранняя птушка*** | ***Ранняя птушка** зубкі цярэбіць, а позняя вочкі працірае.* |

**КАМЕНТАРЫЙ:** Пры праверцы ўлічваюцца і варыянтны прыказак, блізкія па значэнні да арыгіналаў.

**Заданне 4**

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: сказы *1, 3, 5*.

1. Этыкетная паслядоўнасць прывітанняў: маладзейшы вітае старэйшага, мужчына – жанчыну, ***малодшы*** па чыну – ***старшага***.

3. Самы ***стары*** кенійскі школьнік, 88-гадовы Кімані Нганга Маруге, вымушаны быў пакінуць парту і адправіцца ў дом састарэлых.

5. Найвышэйшых паказчыкаў па намалоце збожжа дасягнулі Іваноў Алег Анатольевіч, ***старшы*** камбайнер, і Паграбецкі Аляксей Леанідавіч, якія намалацілі 1201,9 тоны збожжа, убралі 416 гектараў.

## Заданне 5

| | |
|---|---|
| **1.** падбаць за дзяцей | падбаць ***аб дзецях*** (***пра дзяцей***) |
| **2.** даведка на стан здароўя | даведка ***аб стане*** (***пра стан***) здароўя |
| **3.** зарука для плённага развіцця | зарука ***плённага развіцця*** (***плённаму развіццю***) |
| **4.** пачцівы да старых | пачцівы ***са старымі*** |
| **5.** імунітэт на хваробу | імунітэт ***супраць хваробы*** (да хваробы ёсць у слоўніку!) |

## Заданне 6

| |
|---|
| **1.** ***Не хто іншы***, як удзельнік алімпіяды, ведае асаблівасці падрыхтоўкі да яе. |
| **2.** ***Ніхто іншы*** не ведаў, толькі ён, як цяжка рыхтавацца да алімпіяды. |
| **3.** ***Нехта іншы***, можа, і не ведае адказу на заданне, але толькі не мы. |

## Заданне 7

| | |
|---|---|
| (Абы)яку – (абы)як, | ***абыяку, абы-як*** |
| Або гэтак, або так.<br>(Абы)яку – абы, | ***абыяку*** |
| (Абы)збыць (абы)куды | ***абы збыць, абы-куды*** |
| (Абы)што, (абы)чыё, | ***абы-што, абы-чыё*** |
| (Абы)толькі не сваё.<br>(Абы)як – абібок. | ***абы толькі***<br>***абыяк*** |
| Вось і ўвесь яго<br>Урок.<br>(*Васіль Вітка*) | |

КАМЕНТАРЫЙ: У тэксце аўтар па-майстэрску «абыграў» значэнне элемента ***абы***, які выступае ў ролі часткі назоўніка – ***абыяк (абыяку)***, – з якім пішацца разам; часткі прыслоўя ці займенніка, з якімі ён пішацца праз злучок – ***абы-як, абы-куды, абы-што, абы-чыё***; умоўнага злучніка ў спалучэнні з часціцай ***толькі*** (***абы*** толькі не сваё) ці часціцы са значэннем паслаблення патрабаванняў да дзеяння (***абы*** збыць), з якімі, канешне, пішацца асобна.

## Заданне 8

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ:
Празаічны, Уладзімір Караткевіч, Уладзімір Караткевіч, апавяданне; Аркадзь Куляшоў, балада; Вершаваны, Кандрат Атраховіч, {алегорыя, увасабленне людзей праз жывёл, камічнасць сітуацыі, гумар, блізкасць мовы да гутарковай і іншыя характарыстыкі выяўленчых сродкаў}, не могуць лічыцца правільнымі адказы, якія характарызуюць толькі змест і ідэю твора (высмейванне невуцтва, выкрыццё заганаў і да т. п.).

## Заданне 9

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ:
Шпаркі, ледзьве, хваляй, сэрца. “Маёвая песня”. Максім Багдановіч.

## Заданне 10

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ:
“Магіла льва”, ліра-эпас (ліра-эпічны), паэма, Янка Купала, Машэка.